Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
"Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны"

# 20 ГАДОЎ ГІСТАРЫЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ

## ЗБОРНІК НАВУКОВЫХ ПРАЦ

Гомель
2009

*Аляксандр Грахоцкі*

# РАСІЙСКАЯ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ЎРАДАВАЙ ПАЛІТЫКІ Ў БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

На развіццё расійскай гістарыяграфіі гісторыі Беларусі ў другой палове XIX ст. найбольшы ўплыў зрабіў той моцны сацыяльна-палітычны рэзананс, які быў выкліканы ў палітычным і грамадскім жыцці Расіі падзеямі паўстання 1863-1864 гг. і мерапрыемствамі па яго падаўленню. Яны сфакусіравалі на шэраг гадоў увагу расійскай улады і грамадскасці на заходніх губернях імперыі. Гэтыя падзеі падштурхнулі многіх публіцыстаў, грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў, навукоўцаў краіны «адкрыць» для сябе «Белоруссию».

Як вядома, асноўнай мэтай паўстання было адраджэнне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. У сувязі з чым, перад расійскімі уладамі паўставала задача, акрамя падаўлення паўстання, нейтралізаваць польскія прэтэнзіі на Беларусь і легітымізаваць рускае панаванне у краі. Дзейным выканаўцам гэтай задачы на Беларусі быў віленскі генерал-губернатар М.М. Мураўёў (1863-1865 гг.). М.М. Мураўёў лічыў неабходным канчаткова і беспаваротна замацаваць у расійскай грамадскай свядомасці думку аб тым, што тэрыторыя Беларусі - гэта спрадвеку руская зямля. Паўстанне 1863-1864 гг. у рыторыцы М.М. Мураўёва прадстаўлялася як інтрыга польскіх паноў і ксяндзоў, якія праз адраджэнне Польшчы імкнуліся зноў зняволіць, вызваленых царом, «рускіх» сялян [1, с. 497-498]. Зыходзячы з гэтага, рускія войскі ў Беларусі павінны былі прадстаць у вачах расійскай і заходнееўрапейскай грамадскасці не карнікамі і душыцелямі нацыянальна-вызваленчага паўстання, але абаронцамі прыгнечанай «польскім ярмом» «рускай народнасці». Гэтак, мураўёўская рыторыка паступова ператваралася ў своеасаблівую



Грахоцкі
Аляксандр
[illegible]

ідэалагічную дактрыну, якая стала моцным падмуркам большасці прац па гісторыі Беларусі расійскіх гісторыкаў кансерватыўнага накірунку. Сярод расійскіх дарэвалюцыйных даследчыкаў, якія займаліся вывучэннем праблемы, умоўна можна вылучыць дзве канцэптуальныя плыні: кансерватыўную і ліберальную. Да кансерватыўнай мы будзем прылучаць гісторыкаў, якія ў сваіх працах даводзілі «спрадвечна рускі» характар «Паўночна-Заходняга краю», ухвалялі русіфікацыйныя мерапрыемствы расійскай адміністрацыі ў краі. Да другой плыні мы прапануем адносіць навукоўцаў, якія крытыкавалі палітыку самадзяржаўя ў Беларусі, адзначалі самабытны характар беларускіх земляў.

Абсалютная большасць даследаванняў, прысвечаных тым ці іншым аспектам урадавай палітыкі ў Беларусі ў другой палове XIX – пач. XX ст., належыць гісторыкам і публіцыстам кансерватыўнай плыні. Падчас падаўлення паўстання 1863-1864 гг. у расійскай грамадскай думцы разгарнулася шырокая дыскусія аб правамернасці і справядлівасці ўрадавай палітыкі ў Паўночна-Заходнім краі. Актыўную падтрымку ўраду аказалі ідэолагі расійскага славянафільства (Ю.Ф. Самарын, І.А. Аксакаў, А.Ф. Гільфердзінг і інш.). На старонках славянафільскіх выданняў «День», «Москва», «Русь», «Русский вестник» друкаваліся хвалебныя артыкулы ў гонар «выратавальніка рускай народнасці» ў Паўночна-Заходнім краі М.М. Мураўёва, маляваліся яркія вобразы варожага «рускай справе» «паланізма», абгрунтоўвалася гістарычная перавага Расіі над Польшчай [2].

З крытыкай палітыкі М.М. Мураўёва ў Паўночна-Заходнім краі выступалі такія Пецярбургскія выданні, як газета «Весть», «Санкт-Петербургские ведомости», «Новое время» [3, с. 70-71]. Аднак неабходна адзначыць, што на старонках гэтых выданняў крытыкаваўся не сам факт задушэння нацыянальна-вызваленчага паўстання, які пазбаўляў польскі, літоўскі і беларускі народы права на самавызначэнне, а толькі карныя мерапрыемствы М.М. Мураўёва супраць «польскага» дваранства, якія парушалі саслоўныя асновы імперыі і правы прыватнай уласнасці. І толькі на старонках герцэнаўскага «Колокола» выкрывалася «злачынная» сутнасць палітыкі па падаўленню паўстання і русіфікацыі Беларусі [4].

У 1864 г. М.М. Мураўёў даручае генерал-маёру В. Ратчу напісаць гісторыю «польского мятежа» у Паўночна-Заходнім краі [5]. Менавіта ў гэтай працы мураўёўская палітычная рыторыка ўпершыню знайшла сваё ўвасабленне як гісторыка-ідэалагічная дактрына. У манаграфіі аўтар ухваляе карныя дзеянні М.М. Мураўёва, характарызуючы іх як справядлівую барацьбу генерал-губернатара з «крамольным польскім

...ствам і ксяндзамі» за панаванне «рускай народнасці» ў краі [5, [illegible]].

Значную ролю ў стымуляванні даследчай працы па праблемах дзейнасці М.М. Мураўёва ў Паўночна-Заходнім краі адыграла выданне мураўёўскім чыноўнікам (членам Віленскай палітычнай камісіі) М.І. Цылавым у 1866 г. унікальнага па колькасці і разнастайнасці прадстаўленых дакументаў зборніка. У сваім выданні М.І. Цылаў змясціў амаль усе інструкцыі, распараджэнні і цыркуляры генерал-губернатара М.М. Мураўёва [6].

Асвятленне дзейнасці М.М. Мураўёва ў Паўночна-Заходнім краі з'явілася адной з цэнтральных тэмаў даследаванняў прыхільнікаў ідэй рускага нацыяналізму. Яго дзейнасць разглядалася не як пэўны фрагмент рэгіянальнай гісторыі (гісторыі паўночна-заходніх губерняў), але як адзін з найбольш гераічных момантаў гісторыі Расіі. Асоба М.М. Мураўёва становіцца своеасаблівым сцягам рускага нацыяналізму. У рускай нацыяналістычнай літаратуры віленскі генерал-губернатар прадстае узорным дзяржаўным дзеячам, сапраўдным «патрыётам», месіяй, які выратаваў цэласнасць Расійскай дзяржавы, вызваліў «рускую народнасць» у Паўночна-Заходнім краі ад «польскага іншароднага ярма». У якасці яскравых прыкладаў такой літаратуры можна прывесці працы А.А. Парахоўшчыкава, А.А. Турцэвіча [7].

Найбуйнейшым жа ў расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі даследчыкам палітыкі М.М. Мураўёва ў Паўночна-Заходнім краі па-праву можна лічыць гісторыка і археографа, дырэктара музея М.М. Мураўёва ў Вільні А.І. Мілавідава. Яго пяру належыць шэраг прац, прысвечаных розным аспектам палітыкі М.М. Мураўёва на Беларусі ў 1863-1865 гг. Зразумела, што навуковец зыходзіў выключна з апалагетычных ацэнак дзейнасці генерал-губернатар, аднак вялізны фактаграфічны матэрыял выкладзены ў яго працах і па сённяшні дзень мае ім выключную навуковую вартасць [8]. Акрамя таго, намаганнямі А.І. Мілавідава было надрукавана і некалькі зборнікаў архіўных дакументаў, якія змяшчаліся ў мураўёўскім музеі [9].

Шэраг артыкулаў, кніг, зборнікаў дакументаў, прысвечаных палітыцы М.М. Мураўёва ў сферы адукацыі і асветы быў выдадзена бліжэйшым паплечнікам М.М. Мураўёва, І.П. Карнілавым. Не проста гарачы прыхільнік палітыкі М.М. Мураўёва, але і непасрэдны яе ідэолаг і рэалізатар, І.П. Карнілаў імкнуўся надаць выключную важнасці ажыццяўленню «русского дела» ў Паўночна-Заходнім краі, увекавечыць памяць аб «выратавальніку» «рускай народнасці» М.М. Мураўёве і яго паплечніках [10].

Да надрабязнага вывучэння дзейнасці наступнікаў М.М. Мураўёва генерал-губернатараў К.П. фон Кауфмана і Э.Т. Баранава звяртаўся

П. Марозаў [11]. Падаючы на пачатку сваёй працы «хвалебную оценку дзейнасці М.М. Мураўёва, аўтар як бы падкрысліваў велічнасць унікальнасць асобы Мураўёва, з якой не можа параўнацца не адзін яго паслядоўнік. Асноўная ўвага К.П. Каўфмана, як адзначае даследчык, канцэнтравалася на справах распаўсюджвання рускага землеўладання ў краі, пабудовы і рамонту праваслаўных храмаў, паляпшэння сацыяльна-эканамічнага стану мясцовага сялянства. Аднак работа адміністрацыі К.П. Каўфмана, паводле высноў П. Марозава, «не была плодотворна по своим последствиям» [11, с. 18]. Галоўнай заслугай генерал-губернатарства Э.Т. Баранава П. Марозаў лічыў тое, што Баранаў не змяніў «направления принятого его предшественниками». Аўтар падкрэсліваў бяздзейнасць і малаініцыятыўнасць генерал-губернатара, які амаль увесь час свайго праўлення ў краі пражываў у Пецярбургу [11, с. 28-30].

Значную ўвагу дарэвалюцыйных даследчыкаў прыцягвала праблема ўсталявання ў Паўночна-Заходнім краі сістэмы «ограничительного» заканадаўства ў сферы землекарыстання. Гэткія даследчыкі, як А.П. Уладзіміраў, П. Жуковіч, С.Г. Грамачэўскі ў сваіх працах падвяргалі падрабязнаму аналізу ўвесь комплекс урадавых заканадаўчых актаў па гэтым пытанні [12]. Гэтыя даследчыкі цалкам ухвалялі захады расійскай адміністрацыі па ліквідацыі «польскага» землеўладання і абмежаванню правоў палякаў і яўрэяў на набыццё зямельнай маёмасці ў краі.

Асвятленню ўрадавых мерапрыемстваў у накірунку «распалячвання заходнерускага касцёла» прысвечаны шэраг прац прыхільнікаў гэтай ідэі А.П. Уладзімірава, Д. Чыхачова [13].

Да даследчыкаў ліберальнага накірунку, якія краналіся пытанняў урадавай палітыкі на Беларусі ў другой палове XIX ст.- пачатку XX ст. можна аднесці П. Бяссонава, А. Пыпіна, Л.А. Спічакава. У прадмове да выдання «Белорусские песни...» П. Бяссонаў падае ўласныя ўражанні ад працы ў Паўночна-Заходнім краі ў 1864-1866 гг., выкладае сваё бачанне расійскай палітыкі на Беларусі [14]. Прыехаўшы на Беларусь па закліку М.М. Мураўёва для вывучэння народнай культуры, П. Бяссонаў быў абураны русіфікатарскімі захадамі расійскай адміністрацыі ў краі. Даследчык пісаў: «Исстари любя всякую Русскую и следя на месте Белорусскую песню, мы не усматривали победы Русской народности, если бы кто в упоении садился по берегам Вилии в широкий кружок и затягивал «Вниз по матушке, по Волге» [14, с. XVIII]. Не прымаючы самой назвы «Северо-Западный край» (аўтар падкрэсліваў, што больш правільна ўжываць назву «Белоруссия» [14, с. II]), П. Бяссонаў адзначаў самабытнасць беларускага народа, які меў уласную гісторыю і ўласную літаратурную мову (часы Вялікага княства Літоўскага) [14, с. III -V]

Аднак, волей лёсу, - адзначае аўтар, - беларуская дзяржаўнасць «... не достигла ... своего завершения», а беларускую пісьменнасць напаткала «... ранняя смерть на глазах истории» [14, с. III, LXXIV]. Падкрэсліваючы самабытнасць беларускага этнасу, П. Бяссонаў не прызнаваў яго права на самавызначэнне, а лічыў беларускі народ (прынамсі ў сваёй масе) нездольным да нацыянальнага адраджэння. Таму, па словах этнографа, багацейшыя гістарычныя, культурныя і этнаграфічныя здабыткі беларускага народа з'яўляюцца «общерусской» спадчынай, якую неабходна даследаваць і зберагаць, а не падвяргаць гвалтоўнай русіфікацыі [14, с. XV].

Падобныя ацэнкі ўрадавай палітыкі на Беларусі ўтрымліваюцца і ў працы А. Пыпіна [15]. На пытанне - «Ці існуе, асобная ад рускай, беларуская народнасць?»- вядомы рускі этнограф у сваёй працы дае станоўчы адказ: «Существование белорусского «племени» не подлежит сомнению» [15, с. 4]. Па словах аўтара, «уз'яднанне» рускіх зямель пасля падзелаў Рэчы Паспалітай мела выключна палітычны характар: на Беларусі ўсталявалася руская адміністрацыя, аднак да нацыянальнага «слияния» «было ещё далеко» [15, с. 15-16]. А. Пыпін прама вызначаў прычыны русіфікацыйнай палітыкі самадзяржаўя: «Для опровержения польских притензий ... надо было доказать, что западный край есть край русский...» [15, с. 22-23]. Характарызуючы ўрадавыя мерапрыемствы ў Беларусі пасля паўстання 1863-1864 гг. даследчык пісаў: «... Странно было читать в то время, ... что мы должны предпринять обрусение русского края, того края, который теми же самыми людьми выставлялся против польских претензий за чистейший русский, со всеми «давнишними основами русской народности», а вслед за тем оказался столь не-русским и столь попорченным, что надо было его выправить и по-настоящему обрусить...» [15, с. 145].

Л. Спічакаў у сваім даследаванні кранаўся пытанняў канфесійнай палітыкі рускай адміністрацыі на Беларусі пасля паўстання 1863-1864 гг. [16]. Даследчык адзначаў, што пасля паўстання грамадзянскія і рэлігійныя адносіны ў Заходнім краі патрапілі пад кіраўніцтва людзей, «... не доверявших ... всему местному населению» [16, с. 220]. На думку аўтара, гвалтоўнае насаджэнне велікарускай абраднасці і царкоўна-літургічных звычаяў, гвалтоўны перавод каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе нанеслі вялікую шкоду духоўнаму жыццё мясцовага насельніцтва, ператварылі праваслаўную царкву ў паліцэйскую структуру [21, с. 220, 224].

Такім чынам, у расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі не сфарміравалася несупярэчлівага асэнсавання гісторыі Беларусі, у тым ліку і ўрадавай палітыкі ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Сярод даследчыкаў, якія займаліся вывучэннем праблемы, умоўна

можна вылучыць дзве канцэптуальныя плыні: кансерватыўную і ліберальную. Пераважная большасць расійскіх гісторыкаў і публіцыстаў належала да кансерватыўнай плыні. Буйнейшымі прадстаўнікамі гэтай плыні былі В. Ратч, П.Д. Бранцаў, А.І. Міловідаў, І.П. Карнілаў, А.П. Уладзіміраў, П. Жуковіч. Палітыка расійскай адміністрацыі начале з М. Мураўёвым і яго паслядоўнікамі па падаўленню паўстання і «обрусению» Беларусі ў працах гэтых даследчыкаў вызначалася як справядлівая дзейнасць па дэпаланізацыі краю і вяртанню апалячаных рускіх да сваёй народнасці. Ліберальная плынь у гістарыяграфіі адзначала самабытны характар беларускіх земляў. Ліберальныя гісторыкі крытычна ацэньвалі расійскую ўрадавую палітыку ў Беларусі, скіраваную на русіфікацыю мясцовага насельніцтва і абмежаванне правоў палякаў, яўрэяў і беларусаў каталіцкага веравызнання. З крытычных пазіцый асобныя аспекты ўрадавай палітыкі разглядаліся ў працах П. Бяссонава, Л.А. Спічакова, А. Пыпіна.

---


1. [Муравьёв, М.Н.] Всеподданнейший отчёт графа М.Н. Муравьёва по управлению Северо-Западным краем (с 1 мая 1863 г. по 17 апреля 1865 г.) / М.Н. Муравьёв // Русская старина. – 1902. - № 6. – С. 487-510.
2. В.Н. Интересы русской народности в Западном крае // Русский вестник. – 1863. – № 9. – С. 430-437; «День» о современном фазисе польского вопроса в западном и юго-западном крае России // Вестник Западной России. – 1864. - №12. – С. 339-340.
3. Цьвікевіч А. «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. - 2-е выд. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
4. Колокол. Выпуск шестой. 1863 г. Лондон. – М.: Изд-во АН СССР, 1963; Колокол. Выпуск седьмой. 1864 г. Лондон. – М.: Изд-во АН СССР, 1963.
5. Ратч, В. Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-Западной России: в двух томах / В.Ратч. – Вильна, 1867. – Т. 1. – 260 с.
6. Сборник распоряжений графа М.Н. Муравьева по усмирению польского мятежа в Северо-Западных губерниях 1863-1864 гг. / Сост. Н. Цылов. – Вильна, 1866. – 494 с.
7. Пороховщиков, А. Подвиг Муравьёва – настольная книга правителям и правительствам / А. Пороховщиков. – СПб, 1898. – 52 с.; Турцевич, А.А. Краткий очерк жизни и деятельности графа М.Н. Муравьёва / А.А. Турцевич. – Вильна, 1898.
8. Миловидов, А.И. Деятельность графа М.Н. Муравьёва по народному просвещению в Северо-Западном крае (1863-1865 гг.) (По архивным материалам) / А.И. Миловидов // Журнал Министерства народного просвещения. – 1905. – Ч. 360. - № 7. – отд. 3. – С. 30-100; Заслуги графа М.Н. Муравьева для православной церкви в Северо-Западном крае. – Харьков, 1900. – 92 с.
9. Виленский временник. Книга VI: Архивные материалы Муравьёвского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края. Часть 1 / Сост. А.И. Миловидов. - Вильна, 1913. – 462 с.
10. Корнилов, И.П. Памяти графа Михаила Николаевича Муравьёва. К истории Виленского учебного округа за 1863-1868 г. / И.П. Корнилов. – СПб., 1898.

240 с.; Русское дело в Северо-Западном крае: Материалы для истории Виленского учебного округа преимущественно в Муравьёвскую эпоху. – СПб., 1908. – 504 с.
11 Морозов, П. Русское дело в Литовской Руси / П. Морозов // Русский вестник. – 1883. - Т. 166. - № 7-8. – С. 5-73.
12 Владимиров, А.П. О русском землевладении в Северо-Западном крае / А.П. Владимиров // Русское обозрение. – 1894. - № 7-8. – С. 217-241, 746-767; № 9. – С. 171-192; Жукович, П. О русском землевладении в Северо-Западном крае со времени присоединения его к России / П. Жукович. – СПб., 1895. – 75 с.; Громачевский, С.Г. Ограничительные законы по землевладению в Западном крае, с историческим обзором их, законодательными мотивами и разъяснениями / С.Г. Громачевский.– СПб, 1904. – 278 с.
13 Владимиров, А.П. История располячивания Западнорусского костёла / А.П. Владимиров. - М., 1896; Чихачёв, Д.Н. Вопрос о располячении костёла в прошлом и настоящем / Д.Н. Чихачёв. – СПб, 1913. – 112 с.
14 Бессонов, П. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, с очертаниями народного обряда, обычая и всего быта / П. Бессонов.– М., 1871. – 176 с.
15 Пыпин, А.Н. Белоруссия и Сибирь / А.Н. Пыпин // История русской этнографии. – СПб., 1892. - Том IV. – 488 с.
16 Спичаков, Л. Православие и римское католичество на Западных окраинах России / Л. Спичаков // Чтения в императорском обществе истории и древностей российских при Московском университете. – 1872. – Книга 2. Отделение V. – С. 206-233.